ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 103 (485) Чацьвер 15 верасьня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

## Вучоба не за гарамі.

Набліжаецца час, калі дзесяткі тысяч комсамольцаў займуцца вывучэньнем тэорыі клясавай барацьбы і соцыялістычнага будаўніцтва. Ведаць гэта—значыць умець за кожнай дробязьзю практычнай работы бачыць лепшае будучае рабочай клясы.

З кожным годам, разам з узростам культурнага ўзроўню членаў організацыі, растуць і патрабаваньні, прад'яўляемыя комсамольцамі да політвучобы.

Вопыт мінулых гадоў паказаў, што там, дзе гэтыя патрабаваньні здавальняліся, там, дзе школы ішлі ў „ногу з жыцьцём", увязваючы свае гутаркі з політсучаснасьцю, мясцовымі ўмовамі, ажыўляючы экскурсіямі, мастацкімі апавяданьнямі і г. д., заняткі праходзілі добра, і ўцямлівасьць і наведваньне былі на належнай вышыні.

Але гэтае ажыўленьне політвучобы не насіла характару сыстэмы, ня ўсе нашы колектывы ўмелі сваечасова „падмазаць на хаду" тую ці іншую школу і ў большасьці політвучоба праходзіла па старому, кіраўнік „з скуры лез", распінаючыся перад хлапцамі на адцягнутых па сутнасьці справы пытаньнях, і політвучоба ператваралася ў нейкі «закон божы», надаядала, ёю ня цікавіліся. Хто колечы спрабуе зрабіць вывад, што комсамольцы ня хочуць вучыцца. Трэба з усёй цьвёрдасьцю сказаць, што гэта—мана, калі былі асобныя зрывы, асобныя выпадкі выкручваньня, дык толькі як выказваньне неорганізаванага протэсту супроць „казёншчыны і догматызму" ў выкладаньні політзаняткаў.

За мінулы пэрыод ажыўленай работы нашага саюзу ў конкрэтную саюзную, грамадзкую і вытворчую работу ўцягнуты агромністыя масы рабочай моладзі. Задача комсамольскай політасьветы ўвязаць гэтую конкрэтную практыку з вывучэньнем тэорыі ў школе, зьяднаць штодзённыя інтарэсы комсамольца з політвучобай. І аднэй з галоўных умоў такой работы політсеткі зьяўляецца правільнае кіраўніцтва школай з боку колектыву. Калі раней кіраўніцтва выходзіла да „адзергваньня" не наведваючых, дык зараз колектыў павінен ведаць зьмест працы і жыцьцё школы, сваечасова ўнядраючы ў яе злабадзенныя пытаньні грамадзкай рачавістасьці.

Ці трэба казаць аб тым, што дабравольны прынцып комплектаваньня політсеткі ставіць перад цэхавай ячэйкай, перад колектывам вялікую задачу па ахопу вучобай ўсіх членаў організацыі. Лёзунг «няма ніводнага комсамольца па-за вучобай»—павінен стаць баявым лёзунгам дню.

Некаторыя актывістыя падумаюць ужо аб тым, што „калі дабравольны прынцып, дык і рабіць няма чаго: запішацца колькі-небудзь". Гэта называецца іське па лініі найменшага супраціўленьня. Неабходна змагацца, рашуча змагацца з такімі настроямі.

Разгортваньне сеткі політасьветы зьявіцца экзамінам для колектываў: наколькі яны змогуць ахапіць членаў організацыі вучобай—наколькі гэты экзамін будзе вытрыманы.

Шырока растлумачыць і дапамагчы комсамольцам у выбары школы ці гуртка, стварыць умовы для бесьперабойнай вучобы, падабраць кадры добрых кіраўнікоў-прапагандыстых,—ёсьць злабадзённая задача, якая пакажа наўперад і посьпех вучобы.

Кожны комсамолец павінен ясна даць сабе адказ, што змагацца за справу рабочай клясы, ня вывучаючы гэтай справы, ён ня зможа, і ў агромністым будаўніцтве будзе толькі гледачом, перашкаджаючым працы.

## Мы на варце!

### Манэўры Чырвонай арміі

### Сьвята ў Бабруйску.

(Як Бабруйск сустракаў Чырвоную армію).

9-е верасьня—быў выключным днём для Бабруйску. З раніцы ўжо вуліцы і будынкі, асабліва ў цэнтры, мелі сьвяточны выгляд.

Упрыгожаньне гораду і сьвяточны выгляд яго—былі толькі знадворным сымбалем сымпатый бабруйскага пралетарыяту да братэрскай Чырвонай арміі, якая варочаецца ў гэты дзень з манэўраў.

Сапраўднае масавае сьвята пачалося толькі а 4-й гадзіне дня, калі скончылася праца ў прадпрыемствах. У гэты момант усе вайсковыя часьці, якія прымалі ўдзел у манэўрах, прышлі ў Бабруйск і выстраіліся ў рады для параду.

Ня гледзячы на тое, што Чырвоная армія была на манэўрах, рабіла вялікія пераходы і наогул перажывала розныя нявыгоды, зьвязаныя з паходным жыцьцём, чырвонаармейцы мелі бадзёры, нястомлены выгляд.

Стройнымі радамі расьцягнулася на пляцы пяхота, коньніца, артылерыя і іншыя віды зброі, а супраць іх—сталёвыя птушкі, гатовыя па першым загадзе ўзьняцца ўвышыню. На левым фланзе выстраіўся батальён Бабруйскага Асоавіяхіму і тут-жа побач з ім дэлегацыі арганізаванага пралетарыяту гораду.

Потым, адначасова з праходам часьцей цэраманіяльным маршам, у паветра ўзьняліся самалёты, якія лёталі над горадам і яго ваколіцамі больш гадзіны.

Увесь Бабруйск сустракаў вайсковыя часьці, якія пасьля параду праходзілі па вуліцах. На вуліцы высыпаў літаральна ўвесь горад. Арганізаваныя рабочыя і служачыя выстраіліся па абодвых баках вуліцы шпалерамі, прапускаючы такім чынам войска. На некаторых рагох вуліц Чырвоную армію сустракалі з аркестрамі. Жанчыны-работніцы падносілі чырвонаармейцам букеты жывых кветак.



### У час паходу.

У адным з саўгасаў акругі спыніўся на два дні штаб №-кае дывізіі. У штабе стала працуе доктар. Як толькі штаб разьмесьціўся, адразу было вывешана паведамленьне аб тым, што штабны доктар дарэмна прымае ўсіх жыхароў саўгасу. Зразумела, што ўсё насельніцтва саўгасу перабывала ў доктара. Ён ня меў ні воднай вольнай хвіліны. Між тым, да яго ўсё ішлі і ішлі як з бліжэйшых вёсак, гэтак і з больш далёкіх. І доктар Чырвонай арміі нікому не адмаўляў.

Сяляне другой вёскі прыслалі ў вайсковую газэту падзяку з просьбаю абавязкова яе зьмясьціць. Справа была ў тым, што фэльчар №-га артпалку даваў парады сялянам як лячыць коняй, рабіў прывіўку і дапамагаў хворай жывёле мясцовага сялянства.

#### Вечары змычкі.

Чырвоныя часьці вельмі часта арганізоўвалі ў вёсках вечары змычкі з сялянствам. Гэтыя вечары зьяўляліся для сялянства сапраўдным сьвятам. Спачатку чыталі даклады аб міжнародным становішчы, потым пад гармонік патанцуюць чырвонаармейцы з дзяўчатамі, а потым да позьняе ночы ідзе гутарка аб розных пытаньнях.

#### Агітфурманкі.

Асабліва каштоўнай зьяўлялася праца агітфурманак. Вось і даныя: агітфурманка №-й роты сувязі скарыстоўвала на манэўрах кожны дзень. Возьмем, напрыклад, адзін з яе працоўных дзён. 10-я гадзіна раніцы. Агітфурманка разгарнулася. Шмат чырвонаармейцаў і сялян. Старыя бабулькі і моладзь ад 12 да 15 год захапіліся страляньнем уціры. Было шмат добрых пападаньняў у «Чэмбэрлена». Побач з цірам грае гармонік, сьпяваюць прыпеўкі і г. д.

#### Комсамольцы ў першых шэрагах.

Найвялікшую працу, аднак, праводзіў партыйны і палітычны склад арміі. Партыйцы і комсамольцы мелі вялікую нагрузку. Ня было ніводнага сярод іх, які-б не займаўся культурна-палітычнай працай як сярод беспартыйных чырвонаармейцаў, так і сярод насельніцтва.

Комсамольцы праводзілі шэраг гутарак аб росьце ваеннае тэхнікі, аб больш складаным вядзеньні бою, аб неабходнасьці захаваньня ваеннае таямніцы, аб захаваньні здароўя ў паходзе і г. д. Гэта яны організоўвалі ў паходзе сьпевы і чыталі сьмешныя апавяданьні, ствараючы гэтым самым добры і бадзёры настрой.

Комсамольцы зьвярталі ўвагу на шмат дробязяй, якія ў баявых абставінах маюць вялікае значэньне. Яны, напрыклад, рабілі заўвагі запасьнікам на сьцёртыя ногі. Комсамольцы навучалі іх, як абувацца.

Вядома, што на манэўрах войска падзяляецца на дзьве часткі: „чырвоных" і «сініх». Па зразумелых прычынах насельніцтва ўсё-ж больш сымпатызуе „чырвоным". У тых выпадках, калі «чырвоным» прыходзілася адступаць, або іх наступленьне праводзілася ня так шпарка, сялянства жыва на гэта рэагавала і выказвала нездаволеньне, забываючы аб тым, што тут адбываецца толькі вайсковая ігра. І калі ўрэшце «чырвоным» удалося выбіць „сініх" з іх пазіцый, настрой сялянства, якое спачувае «чырвоным», зусім мяняўся. Тут сяляне гаварылі:

— Ага, „чырвоныя" усё-ж перамаглі.

Так было ў часе „вайсковае чыннасьці". Але, калі манэўры скончыліся, сьцёрліся ўмоўнасьці і ня стала ані „чырвоных" ані «сініх» — былі часткі Чырвонай арміі, якія з вялікім посьпехам выканалі свае задачы. Аднолькава дружалюбна, пабратэрску сустракала насельніцтва ўсе часткі.

Ул. Лілін.



## Дом вар'ятаў

(Агляд белагвардзейскага друку).

Пройдземся па асобных палатах дому шалёных «Белая прэса».

Вось ложак з надпісам: «Новое Время». Газэта расійскіх манархістых у Белградзе (сталіца Югаславіі). Газэтка прабуе рабіць «высокую політыку», ганьбіць заходня яўропэйскія ўрады за іх быццам вельмі мяккія адносіны да СССР і да бальшавікоў, лаецца, пагражае.

Па адрасу некаторых буржуазных колаў Францыі, не жадаючых пайсьці па прыкладу ангельскага ўраду і парваць з СССР, «Новое Время» грозна пытае ў перадавой газэты.

— «Ці пытаюць сябе політычныя дзеячы Эўропы аб тым, як адаб'ецца на іх краіне, нават рашуча варожай бальшавікам, перамога гэтых апошніх над кім небудзь з яе суседзяў?»

У другім месцы нейкі Н. Рыбінскі, захлёбваючыся ад уздыму, успамінае аб Напалеоне:

...«Сапраўды, гэта было, як нечаканы бляск маланкі, прыгожае агнявое зьявішча.

— Напалеон!

Напалеон вышаў з агню рэволюцыі, але не ўсякая рэволюцыя абавязкова раджае Напалеона. Але кожны народ, захварэўшы рэволюцыяй, марыць аб ім".

Чытач, пазнаеш душэўна-хворага з варшаўскага допісу? «Новое Время»,—якое марыць аб Напалеоне і «возомнив себя оным», «інструктуе» заходня-эўропэйскую буржуазію—гэта ён, наш «Напалеон 4-ты», які патрабаваў спатканьня з польскім міністрам.

Але які характар яго хваробы? Дакладна сказаць лёгка:

— „Манія вялічча"...

Часам на губах хворага выступае пена і пачынаецца прыпадак. Гэта, калі ён успамінае аб адабраных фабрыках і землях. Вось «марш», напісаны для Крымскага кадэцкага корпусу і яго «сокалаў».

— „Первая задача, первая задача,
Нашу родину спасти!
Чудные кадеты, русские кадеты
Нам другого нет пути".

Ня ісьці-ж на самай справе «чудным» кадэтам, якія займаюцца ў гасьціннай Югаславіі, ва ўрангельскім кадэцкім корпусе, па скачэньню яго служаць лекаямі ў рэстаранах. Застаецца толькі «нашу родину спасти». А, што гэта за бацькаўшчына—гаворыць другая страфа маршу:

— „Силою рассудка, силою удара
Мы должны сразить врага;
Слишком пострадали русские пределы,
Нашы храмы и поля.

Яно і зразумела: чаму-ж не пастаяць за «наши храмы и поля»...

Пастаім, калі Чэмбэрлен дасьць падачку! А Чэмбэрлен і ня супроць даць яе таму, што:

— «Время недалеко, время недалеко.
Будет наш великий слет,
Верные России, верные до гроба
Крымцы выступят вперед»...

Што-ж будзе, калі нашы «чудные» кадэты «выступят вперед»?. Аб гэтым яны адкрыта расказваюць:

— «И тогда мы справим тризну,
Дорогие сокола—
Вновь увидим мы отчизну
И двухглавого орла»...

Двухгаловага арла, значыць, цара, «караля» і «Напалеона 4-га» з газэткі «За свободу»!. Не, наша азначэньне было правільным. Толькі да «маніі вялічча» трэба дадаць яшчэ адно слова:

— «Буяністы».

Ня будзем яго раздражняць, пойдзем у другую палату. Тут знаёмая нам ўжо „За свободу"!. На ложку, лежачы на жываце—Бурцаў. Стары выкрывацель штосьці піша. Не перашкаджаючы яму, паглядзім на напісанае. Што гэта такое!?

«Ленін пад абаронай дэпартамэнту поліцыі і немцаў» Бедны Бурцаў! Ты падабраў выплюнутую яшчэ 10 год таму назад буржуазным друкам жвачку і жуеш, жуеш яе без канца. Цяжка сказаць і аб тваёй хваробе:

— «Старэчае слабавум'е»...

* * *

... Цяжкае паветра ў доме шалёных «Белая прэса». Цяжка дыхаць сьвежаму чалавеку.

## ЗА ШТО ЯНЫ АТРЫМАЛІ ВЫГАВАР?

### Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ ад 9 жніўня 1927 г.

Бюро Менскага Акруговага Камітэту ЛКСМБ, падводзячы вынікі выхаду комсамольскай організацыі ў лягэры, выключыла некалькіх комсамольцаў з саюзу, якія злосна ўхіліліся ад саюзнай дысцыпліны—катэгорычна адказаўшыся пайсьці ў лягэры. Бюро ЦК, разглядзеўшы апэляцыйныя заявы чатырох таварышоў (сярод іх 2 комсамольцы і партыйцы),—вынесла наступную пастанову:

1. Лічыць бязумоўна правільным у асноўным рашэньне Менскага АК адносна т. т. СЕРАБРАНСКАГА, МІНЬКОВА, РАЙКО І ДАСЬКО, але даючы ім апошнюю магчымасьць выправіць свае памылкі, Бюро ЦК пастанаўляе:

а) т. МІНЬКОВА заставіць у саюзе. вынесьці яму суровую вымову, з папярэджаньнем давесьці да ведама КК партыі аб яго учынку;

б) т. СЕРАБРАНСКАГА заставіць у Саюзе, вынесьці яму суровую вымову і давесьці да ведама КК партыі аб яго ўчынку;

в) т. т. Райко і Дасько заставіць у Саюзе і вынесьці ім суровую вымову.

Друкуемая пастанова бюро ЦК ЛКСМБ аб таварышох, якія не зьявіліся на выхад у лягэры Менскай організацыі, гаворыць, што ў нашых організацыях ёсьць яшчэ асобныя, адзіныя выпадкі расхлябаннасьці і недысцыплінаванасьці.

Выхад Менскай гарадзкой організацыі ў лягэры, бязумоўна, даў добрыя вынікі —падняў зацікаўленасьць комсамольцаў да вайсковай справы.

Адначасова гэты выхад зьявіўся праверкай таго, на колькі організацыя дысцыплінавана і падрыхтавана ў вайсковай справе,—на колькі яна згуртавана і баяздольна.

Мы ня будзем разглядаць падрабязговых вынікаў гэтага мерапрыемства (аб іх шмат пісалася ў газэтах), а дамо некаторую характарыстыку таварышам, аб якіх гаворыцца ў пастанове бюро ЦК ЛКСМБ.

— **Тав. Міньков** (ячэйка друкароў), член КСМ з 1921 г., член партыі, рабочы, ячэйковы актывіст,—на прапанову пайсьці ў лягэр катэгарычна ад гэтага адмовіўся.

Чым-жа матывіруе Міньков свой нявыхад у лягэры?

У заяве на імя КК ЦК ён піша: «я лічу што за тое, што я адзін раз не пашоў у лягэры нельга выключаць з комсамольскай організацыі. У 1921 годзе, калі я быў невялікім хлопцам, я заўсёды хадзіў за 8 вёрст на вайсковыя заняткі, некалькі разоў быў у лягэрах і г. д.

А на пасяджэньні КК ЦК Міньков дадаў, што ідзе зараз у шэрагі Чырвонай арміі і перад гэтым жадае трохі адпачыць, што ён ведае вайсковую справу, тым болей, што ідзе ў армію і яму лягэры нічога-б не далі.

Справа ня толькі ў тым, ці ведае, ці ня ведае асобны комсамолец вайсковую справу (вельмі добра, калі комсамолец умее ўладаць зброяй), але справа ў злосным ухіленьні ад саюзнай дысцыпліны. Т. Міньков—стары комсамолец, сябр партыі, ячэйковы актывіст глядзіць на выхад у лягэры з пункту гледжаньня сваіх асабістых інтарэсаў (мне лягеры нічога-б не далі) і гэтым самым забывае задачу—інтарэсы партыі і комсамолу, калі такі таварыш, як Міньков, павінен быў падаваць прыклад другім, маладым комсамольцам.

— **Тав. Сярабранскі**—член ЛКСМБ з 1922 г., кандыдат партыі, рабочы, актыўны комсамольскі працаўнік—намесьнік старшыні клюбу «КІМ». У лягэры зьявіўся, але як па дарозе ў лягэры, так і ў саміх лягэрах трымаў сябе дрэнна—лаяўся з камандным складам.

Серабранскі таксама дрэнна трымаў сябе ў комсамольскім аркестры (ён быў сэкратаром старастату аркестра), што мела ўплыў на ўвесь аркестр.

**Таварышы Райко і Дасько**—члены КСМ з 1924 г. (ячэйка МШВ МББ), актывісты ячэйкі. Першы—Райко—член бюро ячэйкі і вайсковы работнік, сэкратар цэхавай ячэйкі. Дасько таксама быў політасьветам ячэйкі і зараз зьяўляецца кандыдатам бюро цэхавай ячэйкі.

Абодва катэгарычна адмовіліся пайсьці ў лягэры, матывіруючы тым, што ўжо раз былі ў лягэрах і, па-другое, што згодна постановы акругкому таварышы, якія нарадзіліся ў 1908 г. ад выхаду ў лягэр аслабаняюцца.

Праўда, такая пастанова АК была але яна мела агульны характар, і ні ў якім разе ня выключала магчымасьці таго, што ў асобных выпадках (асабліва калі гаварыць аб комсамольскім активе) т. т. 1908 г. нараджэньня павінны былі ў лягэр пайсьці.

С. Радкевіч.

# Гаспадарку на новы лад.

## Комсамольскія ячэйкі падводзяць вынікі сваёй летняй працы на сельскай гаспадарцы.—Рэзолюцыі „прыняць да ведама“ аджылі свой век. Іх месца займае конкрэтная справа.

**Юнвяскоры! Пішэце аб гаспадарчых дасягненьнях за апошняе лета, аб падрыхтоўцы да 10-цігодзьдзя Кастрычніку і да сьвяткаваньня „Дню Ураджаю“**

### Што далі курсы і нарада?

**(Караткевічы, Бабруйская акруга).**

У красавіку месяцы гэтага году ў нашай вёсцы працавалі двухтыднёвыя сельска-гаспадарчыя курсы. Яны прынесьлі вёсцы вялікую карысьць! Моладзь і пажылое сялянства пазнаёміліся з тым, як **пастаўлена гаспадарка ў некаторых заменных краінах, якія там ураджаі атрымоўваюць, як выгадаваць добрую жывёлу.**

Пасьля гэтых курсаў комсамольская ячэйка шчыра ўзялася за палепшаньне сельскай гаспадаркі.

Створана **сельска-гаспадарчая нарада**, на якой ставіліся пытаньні аб узьняцьці раньняга папару, пратраўліваньне і чыстка насеньня, ужываньне торфу для ўгнаеньня, уцяпленьне хлявоў, пабудоўка кармушак і інш.

Амаль усе сяляне Караткевічаў наведваюць вытворчую нараду, актыўна ў ёй удзельнічаюць і праводзяць пастановы ў жыцьцё.

Па прапанове нарады створана **таварыства па палепшаньню жывёлы**, якое ўжо мае племяннога кныра, быка і барана.

**Говар Алесь.**

### Радасьць „малых“ спраў.

**(Ліст з Магілева).**

**Комсамольцы ў савецкіх гаспадарках.**

У Клімавіцкім раёне ёсьць дзьве савецкія гаспадаркі, у якіх актыўна працуюць комсамольцы. Амаль уся рабочая моладзь уцягнута ў комсамольскую ячэйку, або ў гурткі, што пры ёй існуюць.

Комсамольцы ня толькі прыкладныя работнікі, але і першыя зачыншчыкі ў справе палепшаньня савецкай гаспадаркі. На вытворчай нарадзе імі ўзьнята пытаньне аб ПРЫВЯДЗЕНЬНІ Ў ПАРАДАК СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ МАШЫНАЎ І ІНШАЙ НЯРУХОМАЙ МАЕМАСЬЦІ.

**Прыкладныя гаспадары.**

Комсамольцы ГАЛОЎЧЫНСКАЙ ячэйкі (Бялынічыцкага раёну)—сапраўды прыкладныя гаспадары. У сваіх гаспадарках яны увялі шматпольле, правільны севазварот, сеюць тэхнічныя і культурныя травы. Многія комсамольцы набылі неабходныя сельска-гаспадарчыя машыны. Пагаварваюць аб стварэньні з іх машыннага таварыства.

Некаторых комсамольцаў—гаспадароў, як, напрыклад, Міхась ТАРАСЕНКА з вёскі Бракава (Лупалаўскі р.), РУТКОЎСКІ з вёскі Мокрае (Быхаўскі р.)—вядомы ўсёй акруговай організацыі ЛКСМБ.

**М. Л-да.**

### „Прыняць да ведама“ аджыло свой век.

**(Сьмілавіцкая організацыя ЛКСМБ, Менская акруга).**

З кожным годам пашыраецца гаспадарчая праца ў нашай організацыі. Няма ў раёне ячэйкі, якая-б ня ставіла і не прапрацоўвала гаспадарчых пытаньняў на пасяджэньні бюро, агульным сходзе а таксама і асобнымі комсамольцамі.

Калі ставіцца якое-небудзь пытаньне на прапрацоўку, дык няма такіх выпадкаў, каб пастанову прымалі агульную, ці „прыняць даклад да ведама“, а пастанова гаворыць канкрэтна, што ячэйка можа зрабіць па тым ці іншым пытаньні.

Голацкая ячэйка нядаўна заслухала даклад старшыні сельсавету аб гаспадарчым будаўніцтве і мерапрыемствах сельсавету.

Па гэтаму дакладу яна прыняла наступную прапанову:

— Дабіцца, каб тарфяное таварыства якое існуе ў вёсцы Голацак, у бліжэйшы час узялося за капаньне торфу.

Прапанаваць усім комсамольцам стаць пайшчыкамі тарфяных таварыств, таксама старанцца як мага больш уцягнуць у яго сялян.

Паставіць пытаньне ў вёсцы Казянінках аб неабходнасьці адрамантаваць грэблю па дарозе Казянічкі - Маладнёва.

Комсамольцам сябрам Казянінскай пажар-дружыны пастарацца, каб за грошы, якія мае дружына, была куплена пажарная машына, а ў выпадку, калі гэтага зрабіць яшчэ немагчыма, грошы палажыць у касу ашчаднасьці.

Павесьці рашучую барацьбу супроць траўлі пасеваў і травы, што асабліва любяць рабіць маладыя хлапцы. Барацьбу весьці шляхам растлумачэньня сялянству шкоднасьці ад патраў.

Вось прыклад усяму вышэйсказанаму.

Гаспадарчая праца ў ячэйцы добра пастаўлена таму, што комсамольцы зразумелі яе каштоўнасьць і ахвотна выконваюць усе пастановы, датычныя гэтай працы.

**М. Журавіна.**



### Добрыя гаспадары.

**(Чорна-Вірнянская ячэйка ЛКСМБ, Жлобінскі р.).**

У ячэйцы ёсьць два комсамольца—самастойныя гаспадары: **Гірыловіч А.** і **Мінаў**. Апошні, з часу паступленьня ў ячэйку, старанна ўзяўся за палепшаньне сельскай гаспадаркі. У сучасны момант мае значныя дасягненьні як на полі, так і дома: засеў ўтвараецца ачышчаным насеньнем, у хлявох—відна, чыста, зімою цёпла.

У апошнюю сяўбовую кампанію, на ініцыятыве комсамолкі **Кацман** (сябра сельсавету), пры актыўнай дапамозе комсамольцаў, прывезен у вёску зерна-ачысьціцельны абоз, на якім было ачышчана амаль усё насеньне.

Комсамолец **Панкаў**, па паказаньням аграномаў, сеяў канюшыну. Гэта для суседзяў зьявілася добрым прыкладам і навукаю у справе барацьбы з бяскорміцаю.

Кепскавата тое, што ячэйка не вядзе падліку гэтых гаспадарчых фактаў, які дапамог-б яшчэ больш узмацніць кіраўніцтва комсамольцамі—самастойнымі гаспадарамі.

**Зьмі.**

### Лепшыя кавалі і горшыя сьлесары.

**(Курсы ЦІП. Менск).**

Комсамольская ячэйка курсаў Цэнтральнага Інстытуту Працы Беларусі абвясьціла конкурс на лепшага маладога каваля і горшага сьлесара.

Праводзячы гэты конкурс, ячэйка паставіла сабе мэтай зьнішчыць нядбайнасьць да працы, прагулы і нядысцыплінаванасьць, адначасова з гэтым выявіўшы лепшых, кваліфікаваных маладых рабочых курсаў ЦІП.

Конкурс распаўся толькі тыдні паўтара таму назад.

Моладзь ужо жвава адгукнулася на гэтае мерапрыемства комсамольскай ячэйкі. Штодня ў насьценную газэту паступае ўсё новы і новы матар'ял да конкурсу.

У лік лепшых пакуль што папаў адзін толькі малады каваль **Жаброўскі**. Дзякуючы таму, што ён працуе энэргічна і добрасумлена, бывае спакойны, а не нэрвовым пры кожнай няўдачы, як іншыя заданьні ім заўсёды выконваюцца з нейкай хуткасьцю і акуратнасьцю. Тав. Жаброўскі—адзін з больш дысцыплінаваных рабочых кавальскага цэху.

Затое шмат першых месцаў па конкурсе даюць дапішчыкі насьценгазэты „прыкладным“ сьлесарам. Адчыняем перад вамі іхнюю галерэю:

Львовіч—вучань 2-ой зьмены сьлясарнага цэху. Ён папаў на конкурс да № 1.

Калі ў насьценгазэце зьявіўся аб ім допіс, ён праз некалькі дзён быў вырваны. Справа чыіх рук гэта—нікому невядома. Вучком узяўся за расьсьледваньне гэтага факту хуліганства сярод вучняў ЦІП. Рэдколегія не пасаромілася і яшчэ раз зьмясьціла допіс аб Львовічу. Зараз усе ў ЦІП ужо ведаюць, што Львовіч любіць спаць—гэта характэрная асаблівасьць яго. Ён сьпіць ня толькі ўночы, але і ўдзень, у часе працы.

У цэху пры камандзе «стоп» Львовіч становіцца самым ярым абаронцам лёзунгу аб падняцьці вытворчасьці і працягвае працу. Пры камандзе «садзіся» ён бярэцца за праверку работы. Рабочае месца ў Львовіча ніколі ня бывае ў парадку, ён заўсёды стварае ў цэху абставіны нейкага кірмашу.

Акрамя ўсяго гэтага, Львовіч ня прымае ніякага ўдзелу ў грамадзкай працы. Калі ён быў старшынёй вытворчай камісіі, у насьценнай газэце зьявіўся апавядаючы аб яго працы допіс пад загалоўкам: «Вечная памяць вытворчай камісіі»...

Думаеце вы, што Баброў рускі ня мае падобных Львовічу «асаблівасьцяў», - памыляецеся!

Жадаеце, дадзім вам вытрымкі з налікага вершу, у якім ЦІПаўцы пяюць аб Баброве:

**Хотя в цеху Бобров и**
**так бывает мало.—**
**Он смотрит, чтобы**
**лучше повернуть**
**И из цеха раньше незаметно увильнуть“.**

Быў выпадак, калі ўсе вучні чысьцілі інструманты, а Баброў заняўся чысткай... сваіх рук.

Вучань **Тэро** „тэхнікай“ сваіх учынкаў апярэдзіў першых двух. Ён, бачыце, займаецца вось чым: выцягвае ў другіх курсантаў іх гатовыя работы, „апрацоўвае“ іх і здае пад сваю марку. Самому-ж разумеецца, ня так лёгка што-небудзь зрабіць.

**А Сагаловіч**—комсамолец з 4 зьмены сьлясарнага цэху ў часе працы набіў дзяжурнага струментальнай з-за напільніку, па прычыне таго, што цесната цэху шкодзіла Сагаловічу „разгарнуцца“ як сьлед; бойка была закончана каля варот памяшканьня.

Вось, якіх „гэрояў“ выявіла абвешчаны ячэйкай ЦІП конкурс.

Амаль сотня маладых курсантаў, будучых кваліфікаваных рабочых нашай прамысловасьці, напружана сочаць за ходам конкурсу.

**М. Газэтны.**



### Выпуск школы фабзавуча скурнікаў

Гэтымі днямі Менская школа фабзавучу скурнікаў сьвяткавала 4-ы выпуск кваліфікаваных рабочых. Скончыла школу 3-ое храмаўшчыкоў, 4 фальцары, 2 выцягальшчыкі, 2 пасадчыкі і 5 выпрацоўшчыкаў.

Гэта—першы нармовы выпуск нашай школы.

Пры організацыі школы ў 1921 г. перад ёю была пастаўлена задача: выпушчаць кадры кваліфікаваных рабочых. Задача была цяжкая—трэба было будаваць вытворчую базу для школы, падабраць належны склад настаўнікаў, інструктароў і спэцыялістых, і гэта ня ўдавалася.

Толькі апошні выпуск даў нам ва ўсіх адносінах падрыхтаваныя кадры маладых кваліфікаваных рабочых.

Занаткі ў школе праводзіліся па прынцыпу «працаваць—вучачыся, і вучыцца-працуючы».

Усе выпушчаныя таварышы атрымаюць мейсца на скураных заводах. Яны змогуць ня толькі працаваць, але і кіраваць, і рацыяналізаваць вытворчасьць.

**Лазоўскі.**

# Што робіцца на сьвеце?

**АГЛЯД АПОШНІХ МІЖНАРОДНЫХ ПАДЗЕЙ.**

## Французская буржуазія імкнецца парваць адносіны з СССР.—Эдынбурскі зьезд—крок да абвастрэньня клясавай барацьбы ў Англіі.—Профсаюзныя правадыры выканалі свой доўг перад капіталістымі.—Кітайская рэволюцыя ўступае ў новую паласу.—Ніякія сілы не пераможуць рабоча-сялянскага рэволюцыйнага руху.

### Організоўваюць нападзеньне на СССР.

Увесь рэакцыйны французскі друк распачаў шалёную кампанію супроць СССР.

Повадам для гэтай кампаніі паслужыла заява опозіцыі на нядаўнім пашыраным пасяджэньні ЦК і ЦКК УсеКП(б), якую падпісаў і паўнамоцны прадстаўнік СССР у Францыі тав. Ракоўскі.

Французскі друк узьняў шум вакол тае часткі памянёнае заявы опозіцыі, дзе гаворыцца аб пераходзе на бок Чырвонае арміі кожнага чужаземнага салдата, які ня хоча дапамагаць уласьнікам „свае“ краіны.

Старшыня французскай дэлегацыі для перамаўленьняў з СССР—дэ-Монзі у гутарцы з супрацоўнікамі газэт заявіў:

„Праблема месьціцца ня ў тым, ці застанецца Ракоўскі паслом, а ў тым, ці прыме Францыя савецкага пасла. Аб разрыве ідзе гутарка.

Я не хачу судзіць аб намерах ураду, лічачы сябе, у якасьці старшыні французкай дэлегацыі, абавязаным захоўваць абсалютную стрыманасьць, але я павінен адзначыць, што комуністычная небясьпека хаваецца не ў пасольстве СССР, а ў сыстэме кіраўніцтва Францыі.

Што датычыць Ракоўскага, то я ня бачыў лепшага ў асабовым складзе маскоўскіх дыплёматаў. На працягу доўгіх месяцаў перамоў я ніколі ня мог паскардзіцца на якую-небудзь некарэктнасьць з яго боку, не гаворачы ўжо аб лёйяльнасьці ў адносінах да французскага ўраду і пашаны ў адносінах да Францыі.

Калі-б Ракоўскі пагражаў нашаму ўнутранаму спакою, аднačасова прапануючы згоду, якая-б мела мэтаю гарантаваць мір, то Ракоўскага трэба было-б не высылаць, а інтэрнаваць. Я паўтараю, справа ідзе не аб пасьле, а аб пасольстве.

Трэба змагацца з комунізмам унутры краіны. Што-ж датычыць вынікаў франка-савецкіх перамоў, дык іх трэба перадаць на суд грамадства, на суд выбаршчыкаў.




Фашысцкая Італія не пратэставала супроць рэволюцыі, падпісанай таксама і Каменевым, які зьяўляецца паслом у Рыме, а між тым, Рым адносіцца бяз жаднага спачуваньня да комунізму. Але справа ў тым, што Мусаліні разьлічае на сябе самога“.

Як бачыце, становішча надзвычайна цікавае. Але тлумачыцца яно ня тым, што Ракоўскі апозіцыянэр і падпісаў заяву ў ліку іншых, а ў тым, што ў Францыі набліжаюцца выбары ў парлямант. І вось, каб адхіліць увагу працоўных ад выбарчай кампаніі, каб больш правесьці сваіх кандыдатаў. Гэта адзін бок справы. Другі-ж бок той, што французская буржуазія, як і буржуазія іншых капіталістычных краін, імкнецца парваць з СССР маючыя адносіны і організаваць супроць нас адзіны фронт. Вось сутнасьць той справы, якая зараз распачата французскімі рэакцыянэрамі.

### Саюз ангельскіх рабочых з рабочымі СССР будзе мацнець.

Пасьля тыдню працы закончыўся Эдынбурскі (Паўночная Англія) зьезд ангельскіх профсаюзаў.

Пастановы гэтага зьезду складаюць найбольш чорную старонку здрадніцтва лідэраў у справе рабочае клясы Англіі.

Правадыры яшчэ раз упэўніліся, што найважнейшая для іх небясьпека—гэта рэволюцыянізіраваньне рабочае клясы.

І вось пад знакам барацьбы супроць рэволюцыйных мас і ідзе дзейнасьць «правадыроў» ангельскіх профсаюзаў.

Зусім недарма ўвесь консэрватыўны друк вельмі ўзрадаваны пастановамі зьезду.

Эдынбурскі зьезд яскрава адзначае і тое, што падрыхтоўка грамадзкай думкі да вайны знаходзіцца ў поўным разгары.

Апарат генэральнай рады ангельскіх профсаюзаў ужо гатоў зноў служыць загадам Чэмбэрлена.

Апроч нікчэмных слоў і нікога не абавязваючых пастаноў, на гэтым зьезьдзе нічога ня было чуваць.

Патрэбна было толькі некалькі месяцаў, каб даказаць усю правільнасьць лініі нашага бальшавіцкага ЦК партыі, які сказаў, што Чэмбэрлен праз лідэраў генэральнай рады профсаюзаў даможацца разрыву англа-расійскага камітэту.

У гэтым сэнсе «рабочыя» лідэры ня здрадзілі Чэмбэрлену, яны сумлена выканалі яго загад.

Рабочыя масы Англіі і міжнародны пролетарыят яшчэ раз пераканаюцца ў тым, хто змагаецца за адзінства і хто ідзе ў адну нагу з капіталістымі.

Эдынбурскі зьезд абазначае крок да далейшага абвастрэньня клясавай барацьбы ў Англіі. Усё больш адрозьніваюцца інтарэсы мас ад інтарэсаў вярхушкі профбюракратаў.

Масы паказалі, што яны могуць змагацца, што яны гатовы да барацьбы, ня гледзячы на тое, што гісторыя кінула ім на плечы гэткі цяжар, як здрадніцкіх правадыроў.

Але пролетарыят Савецкага Саюзу ня сумняваецца, што рабочая кляса Англіі вырве ў далейшай барацьбе з сваёй гісторыі Эдынбурскую старонку і пераможа ня толькі капіталістых, але і Макдональдаў і Томасаў—гэтых здраднікаў і прадацеляў інтарэсаў пролетарыяту.

### Кітайская рэволюцыя жыве!

Імпэрыялісты пасьпяшаюцца з пахаваньнем кітайскай рэволюцыі. Рэволюцыя не памерла, яна жыве і ўступае ў новую паласу ўздыму. Але гэты ўздым гібельны для капіталістых. І яны ўсімі сіламі імкнуцца раздавіць рэволюцыйныя сілы Кітаю.

Не здавальняючыся падтрыманьнем Чжан-Цзо-Ліна і Сун-Чуан-Фана, якое адбываецца ў выглядзе грошай, амуніцыі і нават узброенай сілай, Японія адчынена стала на шлях канчатковага пераўтварэньня Манчжурыі і Манголіі (паўночныя часткі Кітаю) у свае калёніі.

Паўнамоцны прадстаўнік Японіі ў Пекіне вядзе перагаворы з мукдэнцамі па гэтаму пытаньню.

Ангельцы актыўна падтрымліваюць паўночных генэралаў супроць паўднёвых рэволюцыйных войск.

Гэта яскрава сьведчыць аб патаемнай англа-японскай змове.

Думка ў іх такая. Японія павінна ўладаць паўночным Кітаем, а Англія усім астатнім.

Імпэрыялісты перасталі нават лічыцца з буйнай кітайскай буржуазіяй.

Яны лічаць, што з капіталістымі дамовяцца, а кітайскую рэволюцыю, як відаць, лічаць канчаткова разьбітай.

Але гэта ня так.

Рабочыя і сялянскія масы Кітаю, крыху ўзмацнеўшы ад удару здрадкай уханскай ваеншчыны (якая аб'ядналася з Нанкінам), ізноў уступаюць на шлях рашучай барацьбы. Атрады рэволюцыйных армій, на чале з Іе-Цінам і Хо-Лунам, маюць буйныя перамогі ў Гуандуне.

У Гуандуне пашыраецца сялянскі рух. Узброенае сялянства далучаецца да рэволюцыйных армій.

Войска рэволюцыі пасьпяхова ідуць к Кантону, сустракаючы на сваім шляху падтрыманьне ня толькі рабочых і сялян, але і актыўную дапамогу з боку ўзброеных сіл.

Сялянскі паўстанчаскі рух ахоплівае ня толькі правінцыю Шандунь, але разрастаецца ў Хунане, Хубее і заходняй частцы Цзянсі.

Рабочыя і сялянскія атрады дашчэнту разьбіваюць карацельныя контр-рэволюцыйныя сілы.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што кітайская рэволюцыя знаходзіцца на новым уздыме, што перамога кітайскіх працоўных мас над імпэрыялістымі і над сваёй буржуазіяй—набліжаецца.

**Алёнін.**

# ПРАЦЯГВАЕМ МІТЫНГ ЧЫТАЧОЎ ГАЗЭТЫ.

## НАЙЛЕПШАЯ АДЗНАКА КАСТРЫЧНІКА—ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СУБОТНІКУ.

### ГАСПАДАРЧЫЯ І САВЕЦКІЯ ЎСТАНОВЫ ПОЙДУЦЬ НАСУСТРЭЧ.

**ТРЭБА УЖО ЗАРАЗ ПАЧАЦЬ ГРУНТОЎНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ПА ЎСІМ КОМСАМОЛЬСКІМ ОРГАНІЗАЦЫЯМ.**

**МІТЫНГ ПРАЦЯГВАЕЦЦА. ХТО ЖАДАЕ ВЫКАЗАЦЦА? У КАГО ЁСЬЦЬ ПРАПАНОВЫ? ЧАКАЕМ!**

**СТАРШЫНЯ МІТЫНГУ: Сёньня мы працягваем мітынг чытачоў газэты прысвечаны абгаварэньню пытаньня «Як лепш комсамольскай організацыі адзначыць 10-годзьдзе Кастрычніка». Прамоўцаў запісалася сімат і пагэтаму мы ня мелі магчымасьці скончыць нашу працу ў папярэднім нумары газэты.**

**Перад тым, як зноў узяцца за спрэчкі, мы лічым неабходным падвесьці кароценькія вынікі папярэдняму абмену думкамі.**

**Большасьць таварышоў выказалася за правядзеньне ЎСЕБЕЛАРУСКАГА СУБОТНІКУ МОЛАДЗІ. Пагэтаму, ня прыпыняючы далейшага ўнясеньня прапаноў аб тым, як лепш адзначыць Кастрычнік, мы запрашаем ўсіх таварышоў, якія будуць выступаць, галоўную ўвагу зьвярнуць на тое, як ПРАКТЫЧНА магчыма правесьці суботнік, якую КОНКРЭТНУЮ ПРАЦУ змогуць даць установы, прадстаўнікі якіх зараз удзельнічаюць на мітынгу. Вось тая заўвага, якую нам пажадана было зрабіць перад пачаткам спрэчак.**

## Ад чаго залежыць посьпех суботніку?

### ПРАМОВА ТАВ. АЛЕСІНА

**(Намесьнік Народнага Камісара Працы)**

Суботнік, бязумоўна, добрая справа.

Але каб ён меў сапраўдны эфэкт і паказаў усяму насельніцтву, што калектыўнай працай мы зможам дабіцца лепшых вынікаў, то перад ім патрэбна добрая **падрыхтоўка**.

**Толькі падрыхтоўка і падрыхтоўка, у ёй галоўны посьпех суботніку.**

Другой ня менш важнай прычынаю, ад якой залежыць так сама посьпех суботніка,—гэта **выбар працы**. З першага погляду, як быццам, выбар працы ня мае рашучага значэньня, але, выбраўшы непасільную, непадыходзячую працу, мы правалім суботнік.

Я зьвяртаю ўвагу тых мясцовых і рэспубліканскіх організацый, якія будуць распрацоўваць падрабязны, дасканальны плян суботніка, на тое, каб яны выбралі работы такія, якія **немагчыма было зрабіць у другі дзень, і якія зьявіліся-б паказальнікам таго, што толькі калектыўнай працай мы іх зможам асіліць.**

Праўда, гэта цяжкая задача; над выбарам якой працы трэба будзе шмат падумаць, але мы ўсе павінны памятаць, што посьпех суботніка залежыць ад яе.

**Належны выбар працы** будзе сьведчыць аб нашай ўпартасьці, аб нашым жаданьні даць сапраўдны, творчы падарунак дзесяцігодзьдзю Кастрычніка.

І яшчэ **выбар працы** пакажа, што толькі ў такі дзень калектыўнымі сіламі мы сапраўды чагосьці дабіліся.

Усё гэта гаворыць за тое, што перад суботнікам **ЦК ЛКСМБ** павінен разам з партыйнымі, савецкімі і профэсыйнымі організацыямі выпрацаваць **дасканальнейшы, падрабязны плян.**

Трэба да гэтай выпрацоўкі ці пасьля яе, прыцягнуць нашыя органы працы тут і на мясцох.

Я добра памятаю мінулыя суботнікі, ні ў якім разе наш сучасны суботнік не павінен быць падобным да тых.

Мы чакаем ад суботніка **організаванасьці, дысцыплінаванасьці акуратнай, добрай працы,** якую павінна выказаць моладзь.

Мінулых зьявішч не павінна быць. Калі раней у часе суботніку многія з таварышоў нічога не рабілі, а толькі шляліся з кута ў кут, трымаючы рыдлёўку ў руках толькі для таго, каб паказаць, што і яны працуюць.

У першую чаргу мы спадзяемся чакаць ад суботніка, пры мінімальна затрачаных на яго сродках, добрую, **рэальную суму.**

Я лічу, што ні ў якім разе суботнік не павінен насіць характар **толькі грамадзкіх работ.**

Стаўка,—на вытворчасьць, завод і фабрыку.

Калі ў аснову суботніка паложым **толькі грамадзкія работы,** то, па першае, што яны не дадуць **чакаемага рэальнага эфэкту,** а, па-другому, што яны проста адымуць працу ў тых беспрацоўных, якія ня згодзяцца дабраахвотна працаваць у суботнік.

Аб гэтых момантах трэба памятаць і іх заўважваць.

Куды лепш і правільней, калі мы пастараемся пусьціць фабрыку, ці хаця-бы **асобны цэх,** або наладзіць ачыстку заводу ад сьмецьця, жалеза і інш.

Асабліва, я лічу, што гэта можна правесьці на **скураных,** лесапільных і мэталюргічных заводах; гэта дасьць і рэальны прыбытак, і дасьць вялікую карысьць, бо нашыя заводы нясуць страты ад сьмецьця, раскіданай скуры, кавалкаў жалеза і г. д.

У сучасны момант інструктары Наркампрацы ўжо рыхтуюць падрабязны, практычны плян работ, і ўдзел у іх Наркампрацы.

З свайго боку лічу, што суботнік—добрая справа.

## Хутчэй за рыдлёўкі!

### Прамова Алеся Пятрыкевіча

**(Малады селянін вёскі Лошыца, Самахвалаўскага раёну, Менскай акругі)**

Таварышы! Я памятаю, як у гэтым годзе, на вялікдзень, моладзь нашай вёскі праводзіла таксама суботнік, але мы называлі яго «нядзельнік».

Моладзь нашай вёсцы праводзіла ўпяршыню.

Мы рабілі спортпляцоўку, раскарчавалі месца ад дрэваў, выраўнялі, акапалі, паставілі ўсё належнае абсталяваньне. Гэты «нядзельнік» прывабіў усё сялянства нашай вёсцы, палову дня стаялі, глядзелі на нас, некаторыя нават з старых сямі за рыдлёўку ўзяліся, поўдня ў вёсцы ня было чутна ні п'янак, музыкі і інш.

Усе сяляне былі ля нас.

А суботнік прахадзіў дружна, ніводнага ня было хто-б лянаваўся, ніводнага хлапца ня было які-б ня прышоў працаваць.

Мы працавалі цэлы дзень з песьнямі і жартамі, і здавалася, што ўсё навокал мела вясёлы, быццам урачысты выгляд.

Доўга, доўга яшчэ ўвечары з пляцоўкі нясьліся бадзёрыя песьні, пад мілагучны акомпанімэнт гармоніка.

А як было прыемна глядзець на роўны, прыгожы кавалак, колектыўна апрацованай зямлі...

З вялікім уздымам мы сустрэлі думку аб організацыі суботніка. Хлопцы самі хацелі ісьці ў саўхоз і прасіць каб далі садзіць яблынькі...

І калі будзе суботнік, трэба каб вышэйстаячыя комсамольскія органы дагаварыліся з адміністрацыяй саўхозу наконт прадстаўленьня нам працы.

А працы, навакол, хопіць, у саўхозе мы **будзем садзіць яблынькі,** ці прымемся за капаньне **канавы** на балоце.

Я спадзеюся, што і нашы бацькі дапамогуць нам; ячэйка павінна безадкладна ўзяцца за працу, каб у суботніку прыняла ўдзел ня толькі моладзь, **але і ўся вёска.**

Мінулы суботнік, праведзены нашай моладзьдзю пад кіраўніцтвам ячэйкі, быў яскравейшы доказ, што суботнік **сапраўды добрая ф о р м а колектыўнай працы.**

Дык, хутчэй-жа за рыдлёўкі, час ня чакае! Мы павінны паднесьці Кастрычніку добры комсамольскі падарунак.

## Вазьмецеся за кантроль над цэнамі.

### Прамова тав. Наўлянскага.

**(Старшыня праўленьня Белкоопсаюзу).**

Таварышы! Папярэднія прамоўцы ўжо шмат гаварылі аб суботніку, аб яго значэньні і карысьці для моладзі.

Апрача таго, што ён ўваскрэсіць ўспаміны баявых дзён грамадзянскай вайны, ён зьявіцца дысцыплініраваным момантам для моладзі.

Я хачу застанавіцца на некалькіх фактах апошніх месяцаў работы нашых коопэратыўных організацый у вёсцы.

Кожную раніцу, калі прыходзіць пошта, мы атрымоўваем весткі аб нябывалай актыўнасьці і зацікаўленасьці моладзі коопэрацыяй.

Нам сыплюцца **дзесяткі прапаноў,** дзесяткі заўважаньняў, **дзельных** і правільных.

Моладзь сваімі прапановамі расштурхвае сялянства, прыцягвае яго да коопэрацыі.

У цэлым шэрагу месц, калі пасьля заўваг моладзі нізавая сетка спажывецкіх таварыстваў, свае недахопы выпраўляла, мы мелі новых сяброў коопэрацыі з асяродзьдзя дарослых сялян.

Трэба своечасова і неадкладна ўзяцца за выпрацоўку тых прапаноў, пры выкананьні якіх моладзь магла-б адзначыць дзесяцігодзьдзе Кастрычніку.

Я, асабіста, ўношу прапанову, каб моладзь да дзесятай гадавіны Кастрычніку зрабіла-б вялікую і карысную для коопэрацыі роль, **за кантроль над цэнамі;** няхай вылучаныя ячэйкай хлапцы папеременна робяць гэтую праверку.

Мы зьвяртаем увагу моладзі на яшчэ адну вялікую задачу аб якой гаварыў папярэдні прамоўца, гэта—**вярбоўка новых сяброў коопэрацыі.**

Моладзь павінна прыглядацца да складу нізавой сеткі, яна павінна сачыць, каб у коопэрацыю ня пралезьлі кулацкія і варожыя Савецкай уладзе элемэнты.

## Што можа зрабіць вясковая моладзь?

### ПРАМОВА ТАВАРЫША САПРЫЦКАГА.

**(Намесьнік дырэктара Белсельтрэсту).**

Апрача таго, што вясковая моладзь зможа падстроіць дарогі, часткова паправіць школы, работу, якая дала-б магчымасьць выручыць грошы ў суботнік,—знайсьці вельмі цяжка.

Адзіным месцам зьяўляюцца САЎХОЗЫ, дзе сялянская моладзь побач з рабочай моладзьдзю, тут працуючай, змагла-б аб'яўнацца і працаваць. Гэта апрача РЭАЛЬНАГА выніка дало-б яшчэ і вялікі, палітычны эфэкт.

Сярод сялян, якія толькі калі-ні калі ў кніжках чыталі пра суботнікі, гэты момант аб'яднаньня саўхоскай і вясковай моладзі, лішні раз паказаў-бы, што колектыўнае ВЯДЗЕНЬНЕ ГАСПАДАРКІ І РАБОТЫ, БУДЗЕ ЛЕПШЫМ І ЯСКРАВЕЙШЫМ.

Як можна ўважлівей, трэба аднесьціся да працы, як можна лепш кожны павінен будзе выконваць свае абавязкі, бо за вынікамі суботніка будуць сачыць сяляне і па ім судзіць аб карысьці колектыўнай працы.

З гэтай прычыны суботнік у вёсцы будзе мабыць насіць характар цяжэйшы чымсь у горадзе. Вясковая моладзь, за вялікі час да суботніка павінна абмазгаваць і разьмеркаваць кожны абавязак і рух.

Яшчэ было-б лепш і паказальней, каб моладзь змагла прывабіць да сябе старых сялян, каб у суботніку прымалі ўдзел ня толькі моладзь, АЛЕ І ЎСЯ ВЁСКА.

Усё гэта, бязумоўна, залежыць ад ПАДРЫХТОЎКІ. І мне, здаецца, што калежна падрыхтаваўшыся вясковы комсамол гэтыя цяжкасьці пераможа.

З СВАЙГО БОКУ, БЕЛСЕЛЬСАЮЗ І САЎХОЗЫ, ЯКІМІ ЁН КІРУЕ, АБЯЦАЮЦЬ МАГЧЫМАЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ.

У сучасны момант мы можам прадставіць вельмі карысныя работы: гэта капаньне бульбы і абмалот зярна.

Кампанія толькі распачалася і ў тых мясцох дзе ёсьць саўхозы, вясковай моладзі, яна можа даць добрую працу.

Працы ў саўхозах будуць карысным і для Белсельсаюзу і для самой моладзі, бо ня будуць патрабаваць дабавачных сродкаў на іх організацыю.


Якраз у гэты час у саўхозах Белсельсаюзу няма дастатковай колькасьці рабочых і працу суботніку а мы разглядаем як карысную для нас і чакаем яе.

Усё гэта, бязумоўна, будзе толькі тады калі мы зможам добра падрыхтавацца.

Таварышы! Яшчэ раз заклікаю вас, як заклікалі і папярэднія прамоўцы, гэта—каб вы сараз-жа ДОБРА ПАДРЫХТАВАЛІСЯ.

Мы ва ўсім, чым можна будзе дапаможам!

**Падарунак кастрычніку**



Будуюцца новыя цэхі: сталярны у ЦІП'е і ліцейны—у аб'яднанай профшколе.

## Організоўвайце вытворчыя коопэратывы.

### Прамова тав. Красоўскага.

**(Намесьнік старшыні праўленьня Бельсельсаюзу).**

Я лічу, што галоўным момантам адзнакі Кастрычніка, якую можа правесьці моладзь у вёсцы, гэта—**пашырэньне коопэрыраваньня бядняцкіх гаспадарак.**

Нам усім вядома, што ў вёсцы яшчэ пануе надзвычайная цемра, часта бедняк ня ведаюць і не разумеюць значэньня коопэрацыі. Дзякуючы некаторым дрэнным працаўнікам нашай нізавой сеткі, мы маем сярод іх заклятых ворагаў коопэрацыі.

Задача моладзі—высьвятляць такія факты.

Трэба зрабіць усё магчымае, каб беднякоў з іх кепскай і разбуранай гаспадаркай прывабіць да коопэрацыі.

Няхай моладзь, комсамольцы растлумачаць беднату, што з уступленьнем у спажывецкія таварыствы, напэўна будзе расьці і ўзмацняцца іх гаспадарка.

Мы зможам крэдытаваць бядняцкія гаспадаркі, мы зможам ім дапамагчы, і вось гэтыя задачы, гэтую работу няхай моладзь ўнясе ў адзнаку Кастрычніка.

Другой задачай, якая, асабліва ў гэты момант, мае найбуйнейшае значэньне, гэта задача—удзелу моладзі **ў вытворчых коопэратывах.**

Шмат хто ня ведае нават яшчэ, што гэта такое за вытворчыя коопэратывы,—вытворчыя коопэратывы, гэта машынныя, малочныя і інш.

Да 10-х угодкаў Кастрычніка мы павялічваем іх колькасьць, нам вельмі важна, калі моладзь паставіць сваёй задачай ўзбуйненьне іх шэрагаў.

І праўленьне Бельсельсаюзу спадзяецца, што калі гэта будзе пастаўлена ў адну з адзнак дзесяцігодзьдзя, мы будзем мець і пашырэньне коопэратываў і павялічэньне іх сяброў.

**Я ўсімі сіламі падтрымліваю організацыю суботніка, я пастараюся даць вясковай моладзі належныя работы.**

**У сучасны момант мы можам прадаставіць работы па нагрузцы і перавозцы машын, якія разьмяркоўваюцца па коопэратывам.**

## Трэба пусьціць адзін цэх.

### Прамова т. Кострыка

**(дырэктар Белшклотрэста).**

На прадпрыемствах Белшклотрэста, таксама як і на будаўнічых работах «Белгосстроя», вельмі цяжка правесьці суботнік.

Справа ў тым, што моладзь, якая працуе на заводах, амаль што выключна знаходзіцца пры майстрах, як палукваліфікаваная сіла.

А ў сучасны момант становішча з суботнікам будзе тармазіцца тым, што палова заводаў стаіць на рамонце.

Але на працуючых заводах суботнік можа даць некаторыя рэальныя вынікі.

Там, дзе ёсьць некалькі майстраў-комсамольцаў, і дзе працуюць у некалькі зьмен, магчыма моладзь аб'яднаць у адну зьмену, і часткова прыцягнуць дарослых рабочых.

Нарэшце, магчыма рабіць падсобныя работы, або пусьціць адзін цэх.

Мы-ж за гэты час, які астаўся да суботніка, укамплектуем склад моладзі, каб магчыма было пусьціць адзін цэх.

На прадпрыемствах шклотрэсту суботнік толькі тады апраўдае сябе, калі добра яго падрыхтуем.

Трэба зараз-жа высьвятліць склад моладзі на заводах.

## Не адстануць і фізкультурнікі.

### Прамова тав. Лева.

**(Намесьнік старшыні ВСФКБ)**

Таварышы!

Фізкультурнікі чакаюць з нецярпеньнем, іх сталёвыя мускулы гатовы працаваць на паляпшэньне гаспадаркі краіны.

У дзесятую гадавіну мы падлічылі свае дасягненьні і недахопы, кожны гурток на сваім прадпрыемстве будзе рабіць вечар.

На вечары будуць дэманстравацца дасягненьні гуртка, і вечар зьявіцца момантам, калі мы прывабім да сваіх шэрагаў новых хлапцоў.

Гурткі рыхтуюцца да дэманстрацыі, яны выйдуць у аднальковых зімовых вопратках, у нагрудных адзнаках, якія спэцыяльна выдае ВСФКБ.

Ва ўсіх мерапрыемствах, якія будуць праводзіць партыйныя, профэсыйныя і савецкія органы, фізкультурнікі будуць удзельнічаць.

У ўсесаюзны суботнік яны будуць лепшымі; моцнымі і трэніраванымі работнікамі.

## Наш удзел будзе невялікі.

### Прамова тав. Палякова

**(дырэктар „Белдзяржбуду“).**

Таварышы!

Вы мабыць будзеце лічыць што «Белдзяржбуд» ня хоча прадаставіць суботніку работ. На пабудоўлях, суботнік дасьць вельмі-ж мізэрныя вынікі і на шляху яго організацыі будуць стаяць вялікія цяжкасьці.

Калі на рабоце ня будзе тэхніка, ня будзе дзесятніка, такіх работ мы дазволіць ня можам. Будаўнічыя працы,—вельмі адказная і сур'ёзная рэч, дазволіць працу бяз тэхнічнага пэрсоналу, гэта значыць правяліць справу як суботніка, так і пабудовы.

Не кваліфікаваных работ, мы прадаставіць ня можам, прыбіраць сьмецьце, ці якую-небудзь такога сорту работу, мы прадаставіць ня можам, бо ее у нас няма

Таварышы!

Іншая справа, калі вы зможаце прыцягнуць тэхнічны пэрсанал і некаторую частку старых рабочых, тады толькі суботнік дасьць карысьць.

Адны сталяры змогуць самі працаваць на карысьць суботніка, але справа ў тым, што такіх нязначная частка, і другое, што маладых сярод іх зусім мала.

На будаўнічых работах суботнік можа правадзіцца часткова, і нават толькі тады, калі будзе належна організацыйна падрыхтованы.

Цяжкасьці перад ім станць вялікія!

## Значок ТСА-Авіяхіму

Аб выпушчаемых да 10-й гадавіны Кастрычніка юбілейных значках ТСА-Авіяхіму ўжо добра асьвядомлена насельніцтва БССР.

З Гомельскай, Аршанскай і Полацкай акругаў атрыманы запатрабаваньні на звыш чым 2.500 значкоў.

## Юбілей „Юнгэр Арбэйтэр“

Гэтымі днямі газэта яўрэйскай рабочай моладзі „Юнгэр Арбэйтэр“—орган ЦК ЛКСМБ сьвяткуе пяцігадовы юбілей свайго існаваньня.

27-га верасьня выдзе спэцыяльны нумар газэты, цалком прысьвечаны юбілею, у якім будуць зьмешчаны ўспаміны, думкі, пажаданьні чытачоў, юнкораў і супрацоўнікаў газэты.

## Цэнтральны піонэрскі клюб.

Менакрбюро ЮП прыступіла да рамонту і пераабсталяваньня цэнтральнага піонэрскага клюбу.

Пасьля рамонту пры клюбе будуць працаваць сталярная, пераплётная і іншыя майстэрні.

## Збожжа для Беларусі.

Наркамгандлю БССР распрацаваў плян хлебазагатовак на 1927-28 год.

Згодна пляну для БССР павінна быць закуплена 21.300 тон жыта, 8.200 тон іншага збожжа і 18.000 тон ільнянога насеньня.

Збожжа будзе закупацца наступнымі організацыямі: Белкоопсаюзам, Белсельсаюзам, Хлебапрадуктам і Дзяржгандбелам.

## Новыя спэцыяльныя курсы.

* * *

1-га кастрычніка Галоўпалітасьветы адчыняе ў Менску рахункаводна-бухгальтэрскія курсы з коопэрацыйным уклонам.

Пачаўся прыём заяў.

* * *

Наркамасьветы сумесна з Інбелкультам адчыняюць у хуткім часе курсы стэнаграфіі на беларускай, расейскай і яўрэйскай мовах.

Тэрмін занядкаў на курсах 9-цімесячны.

## У кожнай акрузе—ШСМ.

Згодна пастановы Наркамасьветы, сёлета адна сямігодка ў кожнай акрузе будзе рэарганізавана ў школу сялянскай моладзі.

У гэтых школах 25 проц. вучняў будзе забясьпечана стыпэндыяй.

## Інтэрнаты пры школах.

У гэтым годзе пры 25 раённых сямігодках Наркамасьветы адчыняе і абсталёўвае інтэрнаты для вучняў—сялян.

Месцы ў інтэрнатах будуць прадастаўляцца ў першую чаргу дзецям беднякоў.

## 170 маладых дактароў.

Праўленьне БДУ распачала падрыхтоўку да чарговага выпуску Мэдфаку, які адбудзецца ў сярэдзіне Кастрычніка.

Усяго будзе выпушчана 170 маладых дактароў.

## Адбор кандыдатаў ў АБВШ,

16-га верасьня Менская акруговая камісія па ўкамплектаваньню вайсковых школ правядзе адбор кандыдатаў у курсанты АБВШ.

З прычыны гэтага, усім кандыдатам, накіраваным мясцовымі організацыямі і навучальнымі ўстановамі, належыць зьявіцца ў памяшканьне камісіі (Менск, вул. Бакуніна) для іспытаў.

Праезд за свой кошт.

### Армія ў дні сьвята

Да 10-й гадавіны Кастрычніка, камандваньне беларускага вайсковага вокругу сумесна з рэдакцыяй газэты **«Чырвонаармейкая Праўда»**, організуе масавы агляд дасягненьняў вайсковых частак.

Політуправа БВА выдала спэцыяльны загад, які намячае задачы агляду ў выяўленьні і організацыі дасягненьняў па тым, ці іншым галінам вайсковай, політычнай, гаспадарчай і культурнай падрыхтоўкі.

## На мэдаглядзе прызыўнікоў.

### Армія атрымае здаровую зьмену.



Пяць дзён пасьля жараб'ёўкі,—і нізенькія пакоі акрваенкамату ізноў напоўніліся людзкім патокам. Сёньня—**першы дзень мэдагляду прызыўнікоў сталіцы.**

На другім паверсе засядае прызыўная камісія. Сёньня вырашаецца лёс прызыўніка: быць ці ня быць яму ў гэтым годзе чырвонаармейцам.

На лаўцы каля пакою прызыўной камісіі сядзяць чакаючыя. Хутка—іхняя чарга зайсьці.

А ў пакоі—сапраўдная амбуляторыя: сталы закінуты трубкамі, рознымі лекарскімі прыналежнасьцямі... Дактары ў белых халатах...

Першых двух прызыўнікоў доўга ня прышлося аглядваць. Здаровых, вясёлых —іх адразу-ж залічылі ў частку. Пры выхадзе яны ў адзін голас радасна перадалі таварышам: **годны!**

Нізкарослага, худзенькага рабочага з дражджавога заводу **„Пролетары“** прызналі хворым —яго паслалі ў гошпіталь на дасьледваньне. Ён сам ні на што не скардзіўся, але ўрачы адразу «забракавалі».

Бледны кучаравы хлапец ўвесь дрыжэў, калі лекар пальцамі пастукваў па яго сьпіне. Слабы, хваравіты—яму далі адтэрмінаваньне на год.

А вось у гэтага ружовага дзяцюка—цудоўнае здароўе...

Напэўна—у кавалерысты пойдзе!

Усіх выходзячых з пакою ў калідоры абкружае натоўп прызыўнікоў.

— Ну, што, прынялі?

— Паверце,—зьвяртаецца да ўсіх „забранаваны“ хлапец—што я лепш жадаю быць здаровым і пайсьці ў армію, чым мець хоць-бы адзін недахоп і атрымаць адтэрмінаваньне...

* * *

... У маленькім пакойчыку Акрваенкамату што дзень ідзе сур'ёзная праца. Адбіраюць здаровы людзкі матар'ял, моцную зьмену гордасьці працоўных—Чырвонай арміі.

**Міх. Зак.**

## З уздымам.

### (Полацкі раён).

Зараз-жа пасьля тыдню абароны ў 19 сельсаветах нашага раёну былі праведзены конфэрэнцыі прызыўнікоў. З вялікай увагаю прызыўнікі заслухалі даклады аб задачах Чырвонай арміі ў абароне СССР.

...Хутчэй-бы прызыў! Калі пачынаецца жараб'ёўка? Ці можна на яе не зьяўляцца, а проста на мэдагляд?—вось пытаньні, якімі закідваўся кожны дакладчык.

Добра сустрэлі прызыўнікі цяперашні мэтад правядзеньня жараб'ёўкі. Абралі ўпаўнаважаных.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі абгаварылі пытаньне аб прызыве на сваіх сходах і прынялі ўсе меры да падрыхтоўкі ў належным напрамку прызыўнога маладняка. Былі праведзены гутаркі аб становішчы Чырвонай арміі і яе задачах.

Настаў дзень жараб'ёўкі. У 7 гадзін раніцы ўпаўнаважаныя ад розных сельсаветаў запоўнілі яшчэ драмаўшую камяніцу. З імі прышла вельмі нязначная частка прызыўнікоў, якая сама жадала «паспрабаваць шчасьце».

Жараб'ёўка скончана. Хутка пачнецца і самы прызыў, на якім нашыя хлопцы пакажуць сябе, як сапраўдныя сыны рабочых і сялян.

**Юнкор.**

## У тры радкі.

○ Менская акруговая бібліятэка імя Пушкіна абвясьціла **конкурс на лепшага чытача.**

○ Гэтымі днямі ўправа працколектываў пры Наркампрацы прадстаўляе **работу 500 беспрацоўным.**

○ **Менскі акруговы земаддзел разьмеркаваў сярод бяднейшага сялянства на 165 тысяч рублёў лесу.**

○ Гомельскі акрвыканком **вызначыў ліквідаваць да 150 сельсаветаў** па сваёй акрузе.

○ **На першы і падрыхтоўчы курсы Беларускага Комвузу прынята 80 чалавек.**

○ У Магілеве да 10-цігодзьдзя Кастрычніка будзе адчынен **помнік Леніну.**

○ Наркамзем заканчвае асушку **7200 дзесяцін балот у Аршанскай акрузе.**

○ Пэдфак БДУ склікаў **ўсебеларускую конфэрэнцыю настаўнікаў—грамадазнаўцаў.**

○ **Інбелкульт запрасіў у Менск для сталай працы шэраг беларускіх выдатных вучоных з-за мяжы**



## СХІЛІЛІСЯ НАД КНІЖКАМІ...

### Новы навучальны год на Меншчыне.

**Кябывалы наплыў гарадзкой і вясковай дзетвары ў школы.—Адчыніліся новыя сямігодкі і чатырохгодкі.—Вучні забясьпечаны падручнікамі і вучэбнымі прыладамі.**

Пачаўся новы навучальны год. Гарадзкая і вясковая дзетвара зноў узялася, пасьля летніх вакацыяў, за кніжку і сшытак.

Наш супрацоўнік гутарыў з загадчыкам Менакрана тав. Брыгневічам, які наступным чынам ахарактарызаваў пачатак новага навучальнага году:

—Яшчэ ніколі не назіралася такой масы нова-паступаючых у школы, як у гэтым годзе.

У акрузе адчынены чатыры новыя сямігадовыя школы, утворана 12 новых раўналеглых груп, 4 спэцклясы, нарэшце, організавана 89 комплектаў чатырох-гадовых школ.

Да гэтага навучальнага году мы пасунуліся ўперад і ў школьным будаўніцтве: узьведзена і адрамантава 48 будынкаў для школ, усяго на 69 пакояў.

Добра абстаіць справа і з настаўніцкім пэрсоналам. Паслана на вёску 18 чалавек, скончыўшых ВНУ, 48—скончыўшых Пэдтэхнікумы, павышана кваліфікацыя настаўніцтва, прапушчанага праз акруговыя і цэнтральныя курсы перападрыхтоўкі.

Трэба яшчэ адзначыць, што селета усе школы сваечасова забясьпечаны падручнікамі і часткова вучэбнымі прыладамі, якіх было заказана на 62 тысячы рублёў.



У гэтым годзе ўпяршыню значнаму ліку школ даецца ў карыстаньне 420 бібліятэчак па ўсім галінам ведаў.

Дзякуючы ўсяму вышэйсказанаму, удалося селета задаволіць на 90 проц. заявы ад навічкоў, ажыцьцявіць усеагульнае навучаньне ў адносінах дзяцей 8-мі гадовага ўзросту ды інш.

Надалей мы намячаем адчыненьне чатырох новых сямігадовых школ у Сёмкава-Гарадзецкім, Бярэзінскім, Узьдзенскім і Забашэвіцкім раёнах, павялічыць лік спэцклясаў і сельска-гаспадарчых школ.

**Залуцкі**




## „Перамога жанчыны“

### (Кіно „Культура“).

Фільмаў на гістарычныя тэмы, ці якія-б паказвалі жыцьцё за 200-300 год назад, у нас яшчэ вельмі мала. «Перамога жанчыны»—гэта 3-я—4-я спроба кіно пайсьці па гэтым напрамку.

Баярын Нікіта Пладамасаў адчуваў сябе ў сваёй акрузе поўным гаспадаром: штодзённа ён выяжджаў з дому, зьбіваў сялян, раскідваў тавары купцоў, сьнегам націраў твары графам...

Гэта яскравы тып самадура з „шырокім размахам“. У часе аднэй з сваіх забаў Пладамасаў сустрэў дачку суседа—баярына Байцурава—Марфіньку. Марфінька прыглянулася Мікіце і ён, супроць волі бацькоў, аўладзеў ёю. Адбылося насільнае вясельле. Аб учынках Пладамасава даведаўся губэрнатар і самадур напэўна быў-бы арыштаваны, калі-б Марфінька не сказала-б няпраўду, што „пашла волею за баярына“.

Фільм варты тым, што, дзякуючы яму, крыху сабе ўяўляеш жыцьцё у часе Івана Грознага.

Моманты быту, якія ўведзены ў фільм (правядзеньне часу Пладамасавым, прыём гасьцей і інш.)—гэта самае каштоўнае ў „Перамозе жанчыны.

Трэба яшчэ адзначыць ігру галоўных артыстых. **Бакшэеў**, які няўдала спрабаваў выступаць у ролі маладых рабочых („Кірпічыкі“, „Крэпыш“), тут паказаў сябе. Тып баярына Пладамасава яму вельмі добра ўдаўся. Артыстку **Судакевіч** мы бачылі ўпяршыню. Яна дала вельмі добры вобраз баярскай дзяўчынкі.

Кепска толькі, што яе паказваюць мала і гэта яшчэ пры назьве — **„Перамога жанчыны“.**

Дасягненьнем назваць „Перамогу жанчыны“ нельга.

Гістарычную тэму трэба даваць больш глыбока.

**Н. А—кі.**

* * *

**„Перамога жанчыны“**—гэта адзін з тых фільмаў, якія новага на наш экран нічога ня прыносяць.

Фільм паказвае цяжкае жыцьцё сялян, але гэтага мала — больш увагі аддана разьвязваньню любоўнай гісторыі баярына Пладамасава.

„Перамога жанчыны“ глядзіцца неяк бяз цікавасьці.

Шмат з паказанага мы ўжо бачылі ў „Крыльлях Халопа“.

Мы чакалі шмат ад фільму, але памыліліся.

**А. Адашчык.**
**(Ст. Менск МББ ж. д.).**

* * *

Фільм адбівае пераломы ў душы мужчыны-дэспота пад уплывам каханьня да жанчыны. Гэта адно з самых добрых месц у фільму.

Добра справіўся з сваёй ролью Бакшэеў —Пладамасаў. Пра яго партнёршу гэтага сказаць ужо нельга—мала жывой гульні, глядач не перажывае яе трагэдыі.

З добрых месц можна яшчэ адзначыць: працу сялян на полі, кармленьне шчанкоў баярына. Добра паказаны тыпы баяр, графаў і г. д.

Наогул фільм варта паглядзець.

**Я. Гарбацэвіч.**
**(Белпэдтэхнікум).**

## Тэатр „Крывое Люстра“

Пасьля доўгага перапынку Ленінградзкі тэатр „Крывое Люстра“ зноў выступае на нашай сцэне з абноўленым складам артыстых і з новым рэпэртуарам.

Дрэнныя бакі быту, бюрократызм, казёншчына ў нашай працы і інш.—усе гэта вельмі яскрава адбіваецца ў „Крывым Люстры“.

Першыя спэктаклі пакінулі добрае ўражаньне.

Кідаецца ў вочы сатырычная вартасьць рэпэртуару. Кожны сказ, кожнае слова дыша гумарам, усюды адчуваецца тонкая сатыра, якую добра разумее радавы глядач.

Асабліва гэта прыкмета ў пастаноўках „Горе от ума“ (пародыя), „Афармленьне быту“ і „Юбілей вахцёра Баранава“. Усе пералічаныя пастаноўкі закранаюць нашу сучаснасьць, добра аформлены з мастацкага боку. Аднак, трэба адзначыць, што ў пастаноўцы „Юбілей вахцёра Баранава“ рэжысэр крыху „перасаліў“ у падачы тыпажу. Добра напісаная п'еса ад гэтага губляе.

Пастаноўка „Дэкрэт аб адмене каханьня“, паказваючы будучыню, дзе, напрыклад, машына можа вытвараць дзяцей, дае сатыру на сучаснасьць (паказваецца своеасаблівая наша афіцыяльнасьць у будучыне, прасьлаўляюць сказы: „старшыня саюзу прыгожых жанчын паўднёвага раёну“, «райком абароны каханьня» і інш.).

Слабай пастаноўкай ў тэатры „Крывое Люстра“ можна лічыць п'есу „Манастырскі садоўнік“. Сатыры там мала, соцыяльнай устаноўкі яшчэ менш і наогул тэма аб тым, што манастырскія жыхары ня чужыя для „грэху“ —не Амэрыка.

Цікавыя нумары дае балетмайстар Палуянаў. Асабліва добра вышаў балетны нумар „Адзін раўны двум“ ці «Рэжым экономіі ў балеце». Палуянаў здолеў аб'яднаць у сябе адначасова двох танцораў. Здолеў зрабіць свае рухі характэрнымі, як для партнёра—мужчыны, так і для партнёра—жанчыны.

Калі глядзіш пастаноўкі тэатру, прыкмячаеш, што ў залі зусім мала моладзі. А між тым пастаноўкі „Люстра“ больш культурна апрацаваны, чым пастаноўкі шмат якіх другіх тэатраў На апошніх гастролях, якія адбываюцца гэтымі днямі, павінна пабыць наша моладзь.

**М. Т—э.**

## Куды пайсьці.

Сёньня ў Белдзяржтэатры адбудзецца апошняя гастроль тэатру **„Крывое люстра“.** У програме: 1. „Рэвізыя Рэвізору“, 2. „Лекцыя аб шкодзе п'янства“, 3. „Цыганскія рамансы“ (пародыі) і 4. „Чулочніца“.

У кіно **„Пролетары“** працягваюцца гастролі сатырыка Васторгава і выканаўцы цыганскіх рамансаў М. Нароўскай.

## Гіршык і Шамшур.

# Падвойная памылка

### (Канец апавяданьня. Пачатак—у № 102 (484).

«Рыва» ўстала, вышла на балкон.

У гэты час на пасяджэньні Камітэту галасавалі адзіную прапанову па пытаньню аб правакатары «Сенцы».

Гэта даручана было доктару і „Апанасу“. Ціха прайшлі яны міма „Рывы“, выйшлі на вуліцу. А далей было як у кіно-фільме, „Апанас“ і доктар пераходзілі вуліцу. З-за рогу вылецеў „Сенька“ без кепкі--проста на „Апанаса“, а зьлева гудзеў грузавік з паліцыянтамі. „Апанас“ выхапіў рэвольвер, „Сенька“ рвануўся, паваліўся на брук, правая нага сударажна выпрасталася...

А далей страляніна, шум, узрывы...

Ноччу ў дэфэнзыве вусаты харунжы пісаў рапарт:

-- Супраціўленьне... забіта гаспадыня кватэры. Перасьледваньне... на ўздагон... нікога.

4.

Пры блакітным сьвеце электрычнай лямпачкі з абажурам хсьцівы твар пана Рудніцкага робіцца ўрачыстым.

У параўнаньні з ім твар вісячага над яго галавою маршала Пілсудзкага робіцца шэрым і няпрыкметным. Пан Рудзінскі ўхмыляецца Касьцюшцы, затым бярэцца за ўважлівы агляд сваіх пазногцяў. Відаць знаходзіць усё ў парадку і пераводзіць узрок на стоЛь.

На столі таксама нічога цікавага не знаходзіць. Думае. Націскае кнопку № 3. Уваходзіць Несьвіжскі.

— Ну, цяпер дакладайце,—кажа ён дабрадушным тонам—сядайце.

Твар Несьвіжскага плыве і мякчэе ад задаваленьня. Садзіцца на край крэсла:

— Вы ўчора ня скончылі, пане Несьвіжскі.

Несьвіжскі хоча ўстаць.

— Можаце сядзець.

— Пан паручык сёньня нязвычайна добры!-шэрыя вочы яго палымнёюць мяккім хітраватым сьветам.

— Я ўчора распачаў выяўленьне здрадніка, а толькі сёньня а палове сёмага даведаўся...

— Позна, пане Несьвіжскі, даведваецеся! Мною ўжо здраднік „Овад“ выведзены «у расход» а чацьвертай гадзіне раніцою, а вы аб гэтым даведаліся а палове сёмага вечару. А палове сёмага!

Несьвіжскі бялее. Выраз яго твару становіцца надзвычайна дуракаватым.

Паручык пачынае ўхмыляцца. Які, аднак, дурны пан Несьвіжскі! Чаму ён так выпучыў вочы!—разважае Рудзінскі. Яму хочацца голасна засьмяяцца.

— Дарма, пане паручык, сьмяецеся... цьвёрдым, нязвычайным голасам гавора Несьвіжскі.

— Здраднікам быў ня «Овад», а «Сенька». Вось дакуманты.

Паручык не сьмяецца. Кончыкі пальцаў нэрвова барабаняць аб зелень сукна на столе.

— Скрадзеныя паперы былі знойдзены ў кішэні забітага невядомымі «Сенькі», калі ён ляцеў у камітэт папераджаць аб аблаве...

— А палове сёмага быў забіты здраднік, пане паручык. А ў чатыры гадзіны раніцы—грубая памылка!

У морге, амаль што побач, ляжала двое. Два ворага, дзьве памылкі. А крыху далей—жанчына. Ванда Запольская.



## Адказ Чэмбэрлену

Бесядзкая ячэйка КСМ Капаткевіцкага раёну сваімі сіламі сабрала 3 рублі у фонд «НАЧ». Сяляне вельмі ахвотна ахвяравалі і казалі:

— Хай наш ўрад пакажа Чэмбэрлену, што свой нос саваць у справы СССР небясьпечна.

**Комсамолец А. К—у.**

* * *

Гароцкая ячэйка ЛКСМБ, Калінкавіцкага раёну, правяла вечар з дакладам аб міжнародным становішчы. Увесь збор у колькасьці 6 рублёў накіраван ў фонд «НАЧ».

**Б.**

## Паштовая скрынка

**Таратушка М.** (Зембінскі р.)—Допіс аб комсамольцах, якія адрываюцца ад сваіх гаспадарак, зьмешчан ня будзе. Адны агульныя словы, узятыя з іншых друкаваных ужо ў нашай газэце артыкулаў, і ніводнага мясцовага факту. Пішы, старайся агульныя моманты комсамольскай працы падмацоўваць фактамі з працы сваей ячэйкі.

**Сафраненку Кастусю.** Верш „Вялікі пост“ вельмі слабы: зусім ня мае рытму, зьмест адсутнічае, шмат слоў ні беларускіх і ні расейскіх. Зьмешчан ня будзе.

### Знойдзен

— Комсамольскі білет за № 54408 на імя Канарапюка А. Б., выдадзены Менскім АК ЛКСМБ.

Білет знаходзіцца ў рэдакцыі „Чырво Зьмены“.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.